Беларусам не патрэбен Майдан, беларусам патрэбны чэсныя, дэмакратычныя выбары!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

№ 47 (4505)

12 чэрвеня 2020 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

СКАЗАНО!

«...Они должны восстановить этих людей или оплатить им за три, два или за один месяц»



Что ни день, то резонансная новость от претендента на очередной президентский срок Александра Лукашенко. Позавчера он провел совещание по актуальным общественно-политическим вопросам, на котором заявил:

– В последнее время, уверен, и вам так же, как и мне, поступают жалобы от людей по ходу так называемой этой избирательной кампании. Что меня возмущает особенно: в Минске, других городах (это характерно для городов) частные компании увольняют людей. Притом, боюсь сказать «массово», но достаточно много. Я насчет этого соответствующее заявление уже делал. Мало того, увольняют людей – тех, кто не отдал подпись за альтернативных так называемых кандидатов: ты там за Петрова, Сидорова не расписался – уходи.

ОТ РЕДАКЦИИ

Читатели, пожалуй, заметили, что «Народная Воля» воздерживается комментировать высказывания тех, кто в эти дни собирает подписи в свою поддержку за выдвижение в кандидаты на пост Президента Республики Беларусь. Не будем рассуждать и о сказанном А.Лукашенко, тем более что он не назвал ни одного конкретного факта. Но хотелось бы, чтобы немедленно были восстановлены на работе те тысячи людей, которых выставили на улицу в последние месяцы руководители государственных предприятий.

ПАЗІЦЫЯ

У Гродне адбыўся пікет за Лукашэнку



сталі 35–40 чалавек. Сярод іх гараджане пазнавалі многіх мясцовых чыноўнікаў, функцыянераў БРСМ, "Белай Русі".

Паставіць свой подпіс прыйшла і 96-гадовая Валянціна Баранава, ветэран вайны і працы.



Чэргі да палатак былі, але не такія вялікія, як пры зборы подпісаў у розных гарадах за альтэрнатыўных прэтэндэнтаў на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Як адзначылі назіральнікі, у пікавыя моманты ў чэргах

SOS!

Когда речь идет о жизнях людей, политиканству не должно быть места

Статистика Министерства здравоохранения

В Беларуси на 11 июня выздоровели и выписаны 26.643 пациента, у которых ранее был подтвержден диагноз COVID-19. За предпоследние сутки зарегистрировано 750 зараженных, умерли 5 человек.

Всего на вчерашний день было проведено 678.570 тестов. За весь период распространения инфекции на территории страны умерли 293 пациента с коронавирусной инфекцией и рядом хронических заболеваний.

Казалось, с наступлением тепла коронавирус сдаст свои позиции. Увы, не похоже на это. По сведениям Минздрава, за предпоследние сутки в число заразившихся попали 750, умерли 5 человек.

В чем причина того, что эпидемия не покидает Беларусь? Специалисты-медики почти каждый час напоминают по радио, телевидению о необходимости социального дистанцирования, ношения масок в местах массового скопления людей. Как говорится, береженого Бог бережет. Но что мы видим?

Взгляните на снимок внизу. Так выстроили людей на Минском тракторном заводе, когда его недавно посещал Александр Лукашенко. Стоят плечо в плечо. Есть ли хоть один человек в маске? Нет. Это что, всем наплевать на рекомендации медиков? И вообще, почему тому же министру здравоохранения В.Караницу не поставить вопрос ребром перед высшей властью: или она перестанет успокаивать людей, что у нас с коронавирусом все нормально, или медики снимают с себя ответственность за эпидемиологическую ситуацию в стране?

И вообще, странная у господина Караника статистика. Вот и вчера его службы сообщили о том, сколько смертельных случаев произошло из-за эпидемии. Но можно ли поверить в то, что из 293 умерших из-за коронавируса не было ни одного человека, который до эпидемии считался полностью здоровым?

Когда речь идет о жизнях людей, политиканству не должно быть места.



ГАЗЕТА – ЧЫТАЧЫ

У якім накірунку ісці Беларусі – вырашаць Вам разам з «Народнай Воляй»!

Лёсавызначальныя дні наступілі для Беларусі – пачаўся першы этап прэзідэнцкіх выбараў. "Народная Воля" незаангажавана адлюстроўвае падзеі кожнага дня. Мы нікому не служым. Мы служым ПРАЎДЗЕ, інфармацыю падаём з розных бакоў і з розных крыніц.

У якім накірунку ісці Беларусі – вырашаць Вам, шаноўныя сябры, разам з «Народнай Воляй». Канчаткова мы павінны вырашыць будучы лёс Беларусі 9 жніўня. Таму не заставайцеся без «Народнай Волі» ў другой палове 2020 года. Падпісацца трэба **да 27 чэрвеня**. Вас чакаюць у паштовых аддзяленнях і спецыялізаваных пунктах «Белсаюздруку». Нагадваем: ёсць таксама магчымасць аформіць падпіску на «Народную Волю» і не выходзячы з дома. Для гэтага трэба на сайце **belpressa.by** запоўніць падпісны бланк і зрабіць аплату **праз сістэму Webpay** банкаўскай карткай ці **праз сістэму «Расчет» (АРІП)**. У апошнім выпадку неабходна выбраць пункт **«Система «Расчет» (ЕРИП)» – «СМИ» – «Н» – «Народная Воля» – «Подписка»**. Для аплаты трэба ўвесці нумар рахунка, атрыманага на сайце **belpressa.by**. Зрабіце плацеж.

Вы – з «Народнай Воляй», «Народная Воля» – з Вамі!

О ЧЕМ РАЗГОВОР...

Избирательная кампания еще не вступила в по-настоящему соперническую фазу, а стрелы уже полетели с разных сторон. И что удивительно: если когда-то действующий президент и его высокопоставленные чиновники обвиняли альтернативных претендентов на высокий пост в том, что они подпитываются финансами как европейских, так и американских спонсоров, то на этот раз денежное подспорье якобы имеет российское происхождение. Мол, неслучайно влиятельные московские СМИ устремились брать интервью то у одного, то у другого возможного конкурента А.Лукашенко. И вот на страницах газеты «КоммерсантЪ» на днях появилось большое интервью с Валерием Цепкало.

Читателям «Народной Воли» наверняка интересно знать, о чем он поведал россиянам. Публикуем интервью без сокращений, но название нашей страны даем в том виде, в каком оно закреплено в Конституции Республики Беларусь, а не в советском варианте, которого по-прежнему придерживаются в России.

Валерий ЦЕПКАЛО:
«Пусть победит тот, с кем белорусский народ захочет строить свое будущее»



– К Беларуси сейчас приковано внимание из-за приближающихся выборов. Что отличает нынешнюю президентскую кампанию от всех прежних? Есть ощущение, что она сильно отличается.

– В этот раз серьезно активизировалось гражданское общество, и это существенно отличает эту кампанию от всех предыдущих. По сравнению с тем, что мы видели раньше, куда активнее идет процесс сбора подписей за альтернативных кандидатов. Но самое главное – эта кампания проходит на фоне ухудшения экономического положения Беларуси. Десять лет назад в стране еще был экономический рост, но за последние десять лет ВВП не только не увеличился, но даже уменьшился. Реальные доходы населения упали, а это не может не сказаться на общем настроении людей, которое выражается в повышенной активности.

Это, пожалуй, самая активная кампания за последние 20 лет. Она отличается огромным желанием белорусов к переменам, они хотят видеть страну другой. Им хочется слышать альтернативных кандидатов, иметь возможность познакомиться с различными вариантами развития страны.

– Вы уже попали под прицел официальных СМИ и президента. Он высказывается в ваш адрес и порой выбирает не самые приятные выражения. Почему такой накал?

– Это объясняется не только невысоким уровнем личной культуры, но и крайне слабой социальной поддержкой власти и, как результат, ее низким рейтингом. Не исключено, что методом оскорблений, поливанием грязью оппонентов власть пытается как-то поднять авторитет, повысить свой рейтинг. Но в результате таких заявлений ее рейтинг становится еще ниже.

Такого никогда не было. Исходя из голосования на разных онлайн-ресурсах, власть пользуется поддержкой лишь 3 процентов населения. Это не может не сказываться на ее настроениях, и потому она сильно нервничает.

– Беларусь одна из немногих стран, где невозможно опереться на какой-то нейтральный опрос. Есть онлайн-опросы, которые демонстрируют слабость власти, но в то же время это недостаточно репрезентативные опросы.

– В Беларуси действительно запрещены опросы общественного мнения независимыми институтами. Только одна госструктура имеет право проводить опросы. Опросы на информационных порталах вряд ли можно называть классическими рейтингами и репрезентативной выборкой, но даже эти цифры сильно нервируют власть. Это выражается в различных проявлениях, бесцеремонности, грубости, в отсутствии такта в отношении оппонентов, уважения к их политическим позициям. Но достается и обычным людям. Белорусский народ называют «народец» или «народишко». Впрочем, это для белорусской политической культуры не ново. Ранее Лукашенко называл бизнесменов «вшивыми блохами», «жуликами» и «пиявками», а политических оппонентов – «отморозками», «дебилами» и «подонками». Но сейчас такое поведение стало вызывать у белорусов отторжение. Если такая фразеология еще «проглатывалась» лет десять-пятнадцать назад, то сейчас культурный и образовательный уровень белорусов существенно вырос, и они уже не могут спокойно относиться к тому, что людей оскорбляют, унижают, навешивают ярлыки.

«Нас пугали заговорами Госдепа, интригами Россельхознадзора и комиссарами ЕС»

– В команде Александра Лукашенко вы были, по сути, с самого начала его карьеры. Лукашенко образца 1994 года, в чьем предвыборном штабе вы работали, и Лукашенко-2020 – это разные люди?

– Тогда он производил впечатление искреннего человека. Да и в далеком 1994 году было огромное желание поменять коммунистическую номенклатуру. И Лукашенко ассоциировался с желанием перемен. В его команде было много достойных людей. Позднее кто-то ушел в оппозицию, а некоторые пропали без вести. Любому белорусу это все известно.

(Окончание на 3-й стр)

СТАЛО ИЗВЕСТНО...

Обыск в «Белгазпромбанке»

Вчера финансовая милиция Комитета государственного контроля организовала обыск в «Белгазпромбанке», которым 20 лет руководил претендент на должность Президента Республики Беларусь **Виктор Бабарико**.

– Начались обыски у людей, тесно со мной связанных, – появился комментарий Бабарико на телеграм-канале «Выборы видишь?». – Это касается только банковской деятельности. Штаб в безопасности, мы продолжаем работу. Большая просьба не переживать. Банк будет разбираться со своими делами. Мы двигаемся по общему плану. То, что сейчас происходит, – это давление на меня, формирование комплекса вины за людей, которые поверили и пошли. Мне не очень приятно это чувство, я скажу вам честно. Но я к нему готовился.

Святлана Ціханоўская здымае пікеты ў Мінску і абласных цэнтрах

Яна абвясціла аб тым, што 12–14 чэрвеня не будуць праводзіцца пікеты па зборы подпісаў у сталіцы і абласных цэнтрах.

Такое рашэнне прэтэндэнтка на пасаду прэзідэнта матывавала наступным чынам:

"У сувязі з тым, што праходзяць затрыманні, вас караюць суткамі, адбываюцца правакацыйныя дзеянні на пікетах у маю падтрымку, я звяртаюся да вас: калі ласка, у пятніцу, суботу і нядзелю не праводзіць пікеты ў Мінску і ва ўсіх абласных гарадах. Я баюся за вас, і, паверце, ніводны сабраны подпіс не варты таго, каб цярпелі вы і вашы сем'і".

У гэтыя дні збор подпісаў будзе праходзіць у рэгіёнах, дзе небяспека пераследу не такая моцная.

Вольга СІДАРЦОВА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Аляксандр ФУРМАНАЎ: «Я не разумею, за што наогул затрымалі сына, які сядзеў за сталом і збіраў подпісы?»

Нагадаем: 35-гадовага **Дзмітрыя Фурманава** затрымалі падчас збору подпісаў у Гродне 29 мая – схапілі хлопца разам з крэслам з-за стала. У той жа дзень быў затрыманы таксама Сяргей Ціханоўскі і некаторыя яго паплечнікі.

Аляксандр Фурманаў, бацька затрыманага, звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі. У лісце ён напісаў, што Дзмітрый ніякага закона не парушаў, і просіць даць адказы на наступныя пытанні:

1. Чаму ў нашай дзяржаве не выконваюцца патрабаванні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь аб свабодзе выказвання грамадзян?

2. Чаму органы правапарадку замест абароны грамадзян ад самавольства выконваюць зваротныя дзеянні?

3. Як нашым дзецям і ўнукам жыць далей у такой бяспраўнай дзяржаве?

– Пакуль ніякай рэакцыі на мой ліст няма, – распавёў "Народнай Волі" **Аляксандр ФУРМАНАЎ**. – Ніхто з афіцыйных асоб да мяне не звяртаўся. А вось у маіх былых начальнікаў па апошнім месцы працы – у абласным ДТСААФ – ужо цікавіліся маёй персонай.

Але ж я выступаў са зваротам да беларускага кіраўніка не як афіцыйная асоба (тым больш што зараз я ўжо на пенсіі), а ў першую чаргу як бацька. Я не разумею, за што наогул затрымалі сына, які сядзеў за сталом і збіраў подпісы? Ён што, удзельнічаў у нейкай бойцы, некага збіваў? У краіне праходзіць кампанія па зборы подпісаў. Якое ў гэтым парушэнне, калі ты займаешся сваёй непасрэднай справай?



І мяне вельмі непакоіць той факт, што сын працягвае знаходзіцца за кратамі. У яго ёсць праблемы са здароўем, лекі пастаянна патрэбны.

– Па якой спецыяльнасці працаваў ваш сын?

– У Дзмітрыя вышэйшая адукацыя, па спецыяльнасці ён інжынер-механік. Працяглы час быў вядучым спецыялістам у "Гроднааблаўтатрансе", дзе, дарэчы, далі па запросе адваката вельмі станоўчую характарыстыку. Неаднойчы ўзнагароджваўся граматамі…

Але ў гэтай арганізацыі заробак быў не вельмі высокі, а таму сын вырашыў пашукаць больш высокааплатную работу. Пайшоў вучыцца на курсы па падрыхтоўцы праграмістаў і англійскай мовы, як быццам ужо знайшоў добрае месца працы. І вось такое здарылася… Рэальнасць такая, што зараз Дзмітрый знаходзіцца за кратамі.

– Сям'я ў яго ёсць?

– Сын быў жанаты, але якраз і разышоўся з жонкай на глебе таго, што не вельмі шмат зарабляў. Вырашылі дом пабудаваць, сцены ўжо зрабілі, але фінансаў на працяг работы элементарна не хапала. Вось жонка і "пілавала": маўляў, з'язджай на заробкі за мяжу, што ты за мужык, калі не можаш зарабіць? Адным словам, сям'я развалілася. А дзяцей у іх не было…

Але зараз, як бачым, Дзмітрыю не да сям'і і не да новай працы. І я проста ў шокавым стане ад гэтай сітуацыі!

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ВНИМАНИЮ ИЗБИРАТЕЛЕЙ!

Хотите, чтобы выборы прошли без фальсификаций?

Предлагайте свою кандидатуру в состав избирательной комиссии.

Заявление от желающих войти в состав участковых избирательных комиссий принимаются не позднее чем за 3 дня до их формирования – до 21 июня.

Своих представителей могут выдвигать политические партии, общественные объединения, трудовые коллективы. В то же время претендовать на участие в работе избирательных комиссий может любой гражданин, проявивший такую инициативу, обратившись с соответствующим заявлением в местные органы власти, которые по закону призваны заниматься формированием участковых избирательных комиссий.

Манипуляции с волеизъявлением народа исчезнут тогда, когда участковые, территориальные комиссии и ЦИК будут состоять из совестливых и ответственных перед законом людей.

Белорусский народ требует от властей проведения честных, прозрачных, без фальсификаций очередных президентских выборов!

ПРАТЭСТ

Чарговы наступ на вольнае слова

Заява Рады ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў"

5 чэрвеня ў беларускім урадзе адбыліся чарговыя кадравыя перастаноўкі, наступствам якіх, мяркуюць незалежныя эксперты, можа стаць пагаршэнне сітуацыі з правамі чалавека ў нашай краіне. Гэта знайшло пацвярджэнне ўжо ў першых выказваннях новапрызначаных чыноўнікаў. У прыватнасці, міністр інфармацыі Ігар Луцкі ў інтэрв'ю сфармуляваў новую стратэгію свайго ведамства: «*абмежаванне насельніцтва ад інфармацыі, якая наносіць шкоду дзяржаве*». Крыніцай такой інфармацыі міністр палічыў «*інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, старонкі сайтаў, відэахостынгі*». «*Забіць галаву вельмі проста, лічбавы шум досыць сур'ёзна ўплывае на розумы. Задача перш за ўсё дзяржаўных СМІ – разбураць гэты лічбавы шум і даносіць праўдзівую інфармацыю*», – сказаў Ігар Луцкі.

Дзеянні па «*абмежаванні насельніцтва ад інфармацыі, якая наносіць шкоду дзяржаве*», ужо знайшлі свой працяг у затрыманні і пакаранні адміністрацыйным арыштам незалежных журналістаў і відэаблогераў, якія здымалі сюжэты пра пачатак прэзідэнцкай кампаніі ў Беларусі. Такім чынам, праца Міністэрства інфармацыі па "*разбурэнні лічбавага шуму*" цесна спалучана з працай Міністэрства ўнутраных спраў па выкараненні прадстаўнікоў незалежных СМІ і блогераў з удзелу ў асвятленні перадвыбарнага працэсу. Прымяняюцца і правакацыйныя дзеянні з мэтай прыцягнення найбольш актыўных блогераў да крымінальнай адказнасці і абвастрэння абстаноўкі.

Рада ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў" лічыць такія дзеянні грубым парушэннем свабоды выказвання і самавыяўлення ў Беларусі, чарговым наступам на вольнае слова. Арышты грамадзян, якія імкнуцца данесці праўдзівую інфармацыю нашаму народу, а таксама пагрозы адключэння і ліквідацыі незалежных каналаў камунікацыі з'яўляюцца яскравым сведчаннем парушэння гарантаваных Канстытуцыяй правоў і неабгрунтаваных рэпрэсій у дачыненні да ўдзельнікаў мірнага пратэсту.

Артыкул 33 нашай Канстытуцыі недвухсэнсоўна сцвярджае: "*Кожнаму гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне. Ніхто не можа быць прымушаны да выказвання сваіх перакананняў або адмовы ад іх. Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі або асобнымі грамадзянамі, а таксама цэнзура не дапускаюцца*". Сябры Рады ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў" заклікаюць беларускія ўлады спыніць парушэнне Канстытуцыі, пераслед прадстаўнікоў незалежных СМІ, журналістаў, відэаблогераў і ўсіх грамадзян, якія адкрыта і шчыра выказваюцца пра сітуацыю ў краіне.

САЛІДАРНАСЦЬ

Павел ПАЛЕЙЧЫК: «За суткі мне знайшлі і грошы, і новую працу…»

Фельчар хуткай дапамогі з Ліды распавёў "Народнай Волі" пра сваю грамадзянскую пазіцыю, заканчэнне кантракта і неверагодную падтрымку з боку неабыякавых людзей.

Яшчэ ў красавіку Павел Палейчык падчас сустрэчы, якая была арганізавана блогерам Сяргеем Ціханоўскім, выказаўся на камеру пра сітуацыю з каранавірусам у горадзе. А да гэтага Павел звярнуўся за дапамогай да валанцёраў, таму што медыкам не хапала сродкаў абароны.





За ўдзел у стрыме лідскі фельчар атрымаў 7 сутак арышту, а зараз стала вядома, што кантракт, які заканчваецца 9 ліпеня, працягваць з Паўлам Палейчыкам не будуць.

Пасля гэтага на платформе MolaMola запусцілі збор для дапамогі фельчару. Планавалася сабраць 2 тысячы рублёў, але ў выніку амаль за суткі Паўлу назбіралі 20.360 рублёў!

– Пасля школы скончыў Слонімскі медыцынскі каледж і з 2014 года працую ў Лідзе на станцыі хуткай дапамогі, – распавядае пра сябе Павел. – Спачатку, безумоўна, складана даводзілася, але, як кажуць, да ўсяго прызвычайваешся.

– Якія ў фельчара заробкі?

– Апошнім часам зарабляў прыкладна 700–800 рублёў у месяц. Жонка ў дэкрэтным адпачынку, таму грошай хапала ад зарплаты да зарплаты.

Дарэчы, Юля таксама працуе ў Лідскай раённай бальніцы ўрачом-рэаніматолагам, выйшла на паўстаўкі, бо трэба яшчэ і за прыватызацыю жылля штомесяц плаціць.

– Як вы патрапілі на сустрэчу з Ціханоўскім?

– Калі даведаўся, што блогер прыязджае ў Ліду, вырашыў выказацца на камеру пра тое, што на душы набалела, – хацелася сказаць добрыя словы валанцёрам, распавесці пра недахоп машын на станцыі, бо ў нас людзі "хуткую" чакаюць па 2–3 гадзіны. Машыны адпраўляюць і ў Гродна, і ў Слонім, і ў Мінск.

Былі, натуральна, перасцярогі, што могуць быць рэпрэсіі на працы, але я перамог свой страх. Тым больш што нічога крамольнага не казаў. Выказаўся толькі пра тое, што было на самай справе.

– Не думалі, што за гэта дадуць яшчэ і 7 сутак адміністрацыйнага арышту?

– Я ў шоку быў ад гэтага! Я ж не на мітынг ішоў, а да блогера. Не бегаў па вуліцах з плакатамі, не заклікаў да пераварoту ў рупар. Але, як бачым, атрымалася тое, што атрымалася.

Тыдзень давялося правесці ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў, і трэба сказаць, што ўражанні не самыя лепшыя. Смярдзючыя матрацы і коўдры, у камеры цёмна і холадна. Такое доўга не забудзеш!

Хаця варта адзначыць, што міліцыянеры ўсё разумелі і ставіліся да мяне добра.

– Прагназавалі, што пасля гэтай гісторыі кантракт з вамі могуць не працягнуць?

– Рыхтаваўся да гэтага. Таму і звярнуўся праз СМІ да грамадскасці, каб дапамаглі мне знайсці працу, калі ў некага ёсць такія магчымасці. Мне адразу пачалі тэлефанаваць, пісаць, арганізавалі на платформе MolaMola збор сродкаў.

Салідарнасць была проста неверагодная! За суткі сабралі больш за 20 тысяч рублёў, таму ўсім людзям, якія аказалі дапамогу, хачу сказаць вялікі дзякуй. Хаця, шчыра кажучы, апошнім часам я вельмі стаміўся ад усёй гэтай славы. І пагаджаюся на інтэрв'ю больш з-за таго, каб праз СМІ падзякаваць людзям за дапамогу.

– Ці ёсць прапановы па працы?

– Так, ужо на наступным тыдні буду вызначацца, хаця мне яшчэ можна працаваць да 9 ліпеня.

– Не спрабавалі пагутарыць з кіраўніцтвам Лідскай раённай бальніцы?

– Я прыйшоў да галоўнага ўрача бальніцы Вадзіма Трубчыка і запытаўся: "Гэта асабіста ваша рашэнне не працягваць кантракт?" Той адказаў: "Не толькі маё". І параіў пасядзець дома і падумаць. Я так разумею, што падумаць я павінен быў над сваімі "непрыстойнымі" паводзінамі.

Дарэчы, каля 80 калег са станцыі падпісаліся за тое, каб кантракт са мной быў працягнуты. Я затым аднёс ліст з подпісамі галоўнаму ўрачу, але той не ацаніў салідарнасць медыкаў. Ён на гэты ліст нават не зірнуў.

Алесь СІВЫ.

ПОЛИТКУХНЯ

«Без честных и свободных выборов мы не решим ни одну проблему!»

Политик Анатолий Лебедько предлагает председателю Центризбиркома Лидии Ермошиной принять специальное постановление по поводу открытого подсчета голосов.

Эту мысль экс-глава Объединенной гражданской партии озвучил во время презентации «Реанимационного пакета реформ постлукашенковской Беларуси».



«Первая тема, которая предлагается для обсуждения, весьма актуальная на сегодняшний день – «Честные и свободные выборы – главное условие для реформ и перемен». Мы подготовили проект закона о внесении изменений и дополнений в Избирательный кодекс, который не только соответствует международным стандартам, но также имеет положительное заключение Международного института демократии и содействия выборам. В начале 2017 года этот законопроект был передан депутату Палаты представителей Анне Канопацкой и в межведомственную группу, которая была создана при Центральной избирательной комиссии. Актуальность данного законопроекта совершенно понятна: у нас 9 президентских и парламентских кампаний не признаны международным сообществом как легитимные, потому что прошли с нарушениями и не соответствовали международным стандартам. Это говорит о том, что нужно менять и законодательство, и правоприменительную практику.

Сегодня мы делаем акцент на трех важных изменениях.

Первое – каждый участник избирательной кампании должен иметь своего представителя во всех участковых избирательных комиссиях. Это крайне важно! Например, во время последней парламентской кампании было лишь 30 представителей демократической общественности среди 64,5 тысячи членов участковых комиссий. Это означает, что там были представители только Александра Лукашенко.

Второй пункт – серьезное ограничение досрочного голосования. В Беларуси досрочные выборы превратились, можно сказать, в сплошную фальсификацию, и все эти голоса идут в копилку только одного участника. Мы предлагаем очень жестко регламентировать досрочное голосование.

Третий пункт – открытый подсчет голосов. Понятно, что должно быть как можно больше наблюдателей, они должны иметь возможность снимать, делать видео. Важно, чтобы процедура подсчета голосов была абсолютно прозрачной. Это означает, что каждый бюллетень должен демонстрироваться и наблюдателям, и членам комиссии. Безусловно, это несколько растянет процедуру подсчета голосов, но выборы у нас бывают раз в четыре-пять лет, и крайне важно, чтобы был учтен каждый голос.

Законопроект Избирательного кодекса подготовлен, и нам надо добиваться только одного – чтобы он был имплементирован в белорусское законодательство и реализован на практике.

Многие скажут: сегодня невозможно принять этот закон. Но мы можем скооперироваться с Виктором Бабарико, который предложил Декларацию о честных выборах, и другими претендентами на президентский пост, мы можем вместе обращаться к международному сообществу и к белорусским властям и в данном случае настаивать на принятии подзаконного акта. Ведь те три пункта, о которых я говорю, можно так или иначе регламентировать специальным постановлением Центризбиркома. Это означает, что даже сегодня при наличии политической воли можно было бы многое изменить. Было бы желание!

Мы имели коммуникации по этому вопросу с командами Тихановской, Бабарико, Цепкало. Я понимаю, что они сейчас не могут озвучивать какие-то программы, но в период так называемой тишины мы попробуем провести совместный «круглый стол» и выступить с общим посланием к избирателям по поводу честных и свободных выборов. Реформы в образовании, здравоохранении, создание новых рабочих мест – это все можно реализовать только тогда, когда избиратели будут свободно выбирать депутатов и президента. Сегодня каждый должен понять, что без честных и свободных выборов мы не решим ни одну проблему!»

«Этот законопроект был передан в Палату представителей, – *отмечает председатель партии «Зеленые»* **Дмитрий Кучук**. – Но обратной связи с Палатой представителей, к сожалению, нет. Совершенно очевидно, что депутаты Палаты представителей не самостоятельны в своих действиях, потому что их не выбирали, а назначили».

Александр Лукашенко пока еще занимает президентский пост. Не рано ли оппозиция презентует пакет постлукашенковских реформ?

Вот как отвечает на этот вопрос председатель Белорусской социал-демократической партии (Грамада) ***Игорь Борисов***.

«А это как раз показатель того, что у оппозиции есть не только уличные лозунги, – *говорит Борисов*. – Есть совершенно конкретные предложения, и не обращать на них внимания невозможно».

Марина КОКТЫШ.

ЦИФРА ДНЯ

Белстат: в Беларуси насчитывается 3265 действующих крестьянских (фермерских) хозяйств

За последние 9 лет их число увеличилось на треть.



На 1 января 2020 года в пользовании фермерских хозяйств находилось 213,9 тысячи гектаров сельхозугодий, в том числе пахотных – 150,7 тысячи гектаров. По сравнению с 2010 годом сельскохозяйственные земли, занимаемые фермерскими хозяйствами, увеличились на 85,5%, пахотные – на 76,5%. В среднем на одно крестьянское (фермерское) хозяйство приходится 79 гектаров сельскохозяйственных земель.

На протяжении последних лет фермерские хозяйства по темпам роста производства продукции значительно опережали сельскохозяйственные организации.

Объем производства сельхозпродукции в крестьянских (фермерских) хозяйствах в 2019 году по сравнению с 2010 годом увеличился в сопоставимых ценах в 3,1 раза, в том числе продукции растениеводства – в 3,5 раза, животноводства – на 47,5%.

Возросла и доля фермерских хозяйств в общем объеме производства сельскохозяйственной продукции. В 2019 году она составила 2,7% (в 2010 году – 1%): в производстве продукции растениеводства увеличилась с 1,6% до 5,4%, животноводства – с 0,3% до 0,4%.

Основным направлением сельскохозяйственной деятельности большинства (свыше 70%) крестьянских (фермерских) хозяйств является растениеводство. На его долю приходится более 90% производимой фермерами продукции.

Располагая 2,5% от общей площади сельскохозяйственных земель в Беларуси, фермерские хозяйства в 2019 году производили 20,5% общереспубликанского объема овощей, 7,3% картофеля, 2,7% зерна, 2,5% сахарной свеклы. При этом доля фермерского сектора в производстве овощей по сравнению с 2010 годом увеличилась в 3,4 раза, картофеля – в 3,7 раза, сахарной свеклы – в 1,8 раза, зерна – в 1,9 раза.

В общем объеме производства продукции животноводства на долю фермерских хозяйств приходится незначительная часть. Так, в 2019 году их удельный вес в реализации скота и птицы на убой (в живом весе) по стране составил 0,7%, молока – 0,4%. Более весомый вклад фермерских хозяйств в производство шерсти – 13,6%.

Возрос экспортный потенциал крестьянских (фермерских) хозяйств. В 2019 году экспорт продукции составил 66,9 миллиона долларов США (в 2014 году – 55,5 миллиона долларов США). Фермерскими хозяйствами было экспортировано 127,7 тысячи тонн картофеля (в 10,1 раза больше, чем в 2014 году), 5,3 тысячи тонн капусты (на 20,6% больше), 2,2 тысячи тонн лука репчатого и чеснока (в 12,3 раза больше), 15,9 тысячи тонн яблок и груш (в 3,6 раза больше), сообщает *infobaza.by*.

ЭХО

Откроет ли Литва границы с Беларусью?

Глава Минздрава Литвы Аурелиюс Верига считает, что сейчас это «было бы очень рискованно».

«Открываться с Беларусью сейчас было бы очень рискованно, как и с Россией или с другими странами, которые, на мой взгляд, играют в очень небезопасную игру», – *сказал Верига радиостанции Ziniu radijas.* «Похоже, Евросоюз хочет выработать единую стратегию в отношении третьих стран – в плане открытия границ, возобновления поездок, и это на самом деле было бы очень хорошо», – *добавил министр.*

«С любыми такими странами, как Беларусь, где болезнь и отрицают, и звучит очень странная риторика, я думаю, очень опасно спешить открывать границы», – *уверен глава медицинского ведомства Литвы.*

РЭГІЁН

У Гродне падтрымалі хворых на каранавірус

У гандлёва-забаўляльным цэнтры TRINITI адміністрацыя ўстанавіла «добры бокс», куды кожны жадаючы мог пакласці рэчы для хворых на каранавірус. Гродзенцы напоўнілі «добры бокс», і ён быў адпраўлены ў абласную клінічную інфекцыйную бальніцу.

Традыцыйна СМІ паведамляюць аб дапамозе медыкам, якія лечаць хворых на каранавірус. А ў Гродне жыхары горада сабралі для іх больш за 100 кніг, чвэрць тысячы пар шкарпэтак, дзясяткі набораў для малявання і іншай творчасці, некалькі скрынь сродкаў асабістай гігіены, ручнікі і іншыя патрэбныя ў бальніцы рэчы.

Дактары сцвярджаюць, што станоўчыя эмоцыі садзейнічаюць выздараўленню і хутчэйшаму аднаўленню чалавека пасля хваробы.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

ДЗЯКУЙ!

Дапамог старшыня гарвыканкама

Сацыяльная майстэрня Гродзенскага дзіцячага хоспіса атрымала новае памяшканне, дзе людзі з інваліднасцю разам з валанцёрамі і надалей будуць шыць камбінезоны і маскі для медыкаў.



У адным з апошніх нумароў «Народная Воля» паведамляла пра тое, што адміністрацыя дзіцячай палiклiнікі, дзе дзіцячы хоспіс арандаваў памяшканне, у якім валанцёры і людзі з інваліднасцю шылі медыцынскія маскі і камбінезоны, забараніла падобную дзейнасць.

Розгалас пайшоў у СМІ, і ў хоспіс нечакана наведаўся старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў Гой. Пазнаёміўшыся з тым, што робяць неабыякавыя людзі, ён прапанаваў ім новае месца для майстэрні. Прычым без аплаты арэнды.

Кіраўніца сацыяльнай майстэрні дзіцячага хоспіса Святлана Пінчук сказала «Народнай Волі», што яны ўжо пачалі працаваць у новых памяшканнях. Іх там усё задавальняе.

«Канешне, тут месца больш, мы павялічылі колькасць швейных машынак, ёсць асобны пакой, дзе людзі могуць падсілкавацца і адпачыць, – распавядае Пінчук. – *Праца працягваецца, да нас нават стала прыходзіць больш валанцёраў».*

Тое, што старшыня гарвыканкама наведаўся ў сацыяльную майстэрню і дапамог з новым месцам, Святлана Пінчук не здзіўляе.

«Мы апошнім часам атрымліваем ад людзей шмат дапамогі, на нашы патрэбы адклікаюцца многія, – кажа Святлана. – *І мэблю нам прывезлі, і з матэрыяламі дапамагаюць, і многае іншае. Прыемна, калі дабрыня перастае здзіўляць, а робіцца натуральнай справай».*

Нагадаем, што ў сацыяльнай майстэрні дзіцячага хоспіса ў Гродне людзі з інваліднасцю разам з валанцёрамі пачалі шыць медыцынскія маскі і камбінезоны для дактароў ад самага пачатку пандэміі. Усё гэта робіцца за сродкі хоспіса, а вырабленыя рэчы бясплатна перадаюцца ў бальніцы вобласці.

Дарэчы, першую партыю медыцынскіх масак, якую пашылі людзі з інваліднасцю, напярэдадні 9 Мая перадалі ў мінскі шпіталь, дзе праходзяць лячэнне інваліды і ветэраны Другой сусветнай вайны.

Міхал КАРНЕВІЧ.

На здымку: валанцёры сацыяльнай майстэрні Гродзенскага дзіцячага хоспіса і Мечыслаў Гой.

О ЧЕМ РАЗГОВОР...

Валерий ЦЕПКАЛО:

«Пусть победит тот, с кем белорусский народ захочет строить свое будущее»

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Сейчас он полностью оторвался от жизни, не знает, чем живет народ, не понимает его ожиданий. Незнание жизни – результат того, что он 26 лет безраздельно находится у власти. И ничего не меняется! Не меняется риторика, манеры поведения. В мире произошла технологическая и информационная революция, произошла революция в сознании, но ничего не поменялось в этом субъекте. Английский философ Дэвид Юм сказал: «Ничего не меняется в созерцаемом объекте, все меняется в созерцающем его сознании». Лукашенко говорит одно и то же более четверти века, но общество стало другим, оно стало по-другому воспринимать всю эту риторику.

– Как вам в голову пришли мысль, что вы можете быть лучше, чем действующий президент, и решение пойти на выборы?

– Я долго изучал опыт догоняющего развития, перехода ряда стран из третьего мира в первый. К тому же я создал Парк высоких технологий – один из самых успешных технологических кластеров на постсоветском пространстве. Он мог бы служить прототипом для реформирования налоговой системы, промышленности, образования, государственного управления. Я уже говорил: наша страна не развивается. Мы видим деградацию политической системы, которая давно перестала отвечать потребностям людей, неэффективность экономики, что выражается в нищенских доходах, в массовой эмиграции.

Я хорошо представляю себе реалии современного мира и понимаю, что, если так будет продолжаться, Республика Беларусь перестанет существовать как независимое государство.

Нас пугали заговорами Госдепа, интригами Россельхознадзора и комиссарами ЕС. Короче, со всех сторон нас окружают враги. Но пришло наконец время посмотреть на себя и понять, что проблема в нас самих, а не в России, Евросоюзе или США.

Сегодня мы дружим с Венесуэлой, Ираном, со странами, которые от нас далеко и с которыми дружить легко. Гораздо сложнее дружить с теми, с кем ты делишь границы, ведешь торговлю, где есть пересекающиеся интересы. Но нельзя постоянно оскорблять и бросать такие выражения в адрес той же России, да и других стран. Москву последние полгода обвиняют в том, что она виновата в наших бедах, не хочет идти навстречу, а мы такие золотые и прекрасные. В дипломатии, как и в бизнесе, надо уметь понять интересы твоего партнера и уметь их связать со своими целями. Без этого невозможно достичь никаких результатов.

Еще меня и все белорусское общество возмутило поведение руководства страны в связи с коронавирусом. Проблема даже не в том, что опасность была проигнорирована, а что людей фактически держали за глупцов, говоря им, что, если вируса не видно, значит, его вообще нет. Меня больше возмутило, что власть, которая до этого наказывала, штрафовала, карала, взыскивала, сажала, вдруг исчезла в тот момент, когда пришло время хоть как-то помочь людям и бизнесу, как-то их поддержать. Это возмутило очень многих.

– Обычно сторонники президента и он сам подчеркивают, насколько Беларусь выигрышно смотрится на фоне многих стран бывшего СССР. Что вот в Украине случились две революции и сейчас идет война, в Грузии была революция, потом война, а бедную Молдову все время лихорадит. У вас же в стране все эти годы штиль и Лукашенко. И это обозначается как заслуга президента. На такую позицию что вы можете ответить?

– У нас есть по соседству Литва, Латвия, Польша. Есть еще Чехия, Словакия, Болгария, Румыния, где нет никаких войн, где идет экономическое развитие. Литва, которая в три раза меньше Беларуси, нас уже по ВВП почти догнала. Не говорю о Чехии, с которой четверть века назад при десятимиллионном населении у нас был сопоставимый ВВП. Теперь же население Чехии увеличилось, а у нас уменьшилось на 750 тысяч человек. А ВВП там в четыре раза больше, чем ВВП Беларуси. И что там? Война? Конфликты? Какие-то революции?

Не надо кивать на Украину. Мы переживаем за нее, но я считаю, что они сами должны решать свои проблемы, а мы должны решать свои. Убежден, что сменяемость власти, ротация – это обязательное условие развития. И потом, Беларусь представляет собой более или менее однородное общество. Мы не настолько велики, как Украина, где существуют разные культурные доминанты. И мы не похожи на Молдову, где одна часть населения больше стремится к Румынии, а другая относит себя к славянскому миру. Это разрывает страны.

Не надо рисовать страшилки. У нас нормальная страна, толерантный, образованный, культурный народ. Людям надоело более четверти века смотреть одну и ту же картинку, которую нам предлагают смотреть еще неизвестно сколько. Ладно бы это хоть было связано с экономическим развитием. Но его-то и нет. На фоне меняющегося мира мы живем в каких-то неофеодальных представлениях о том, какими должны быть государство и власть. У нас нет многопартийности в парламенте, нет независимой судебной системы. Это все придется создавать. Все надо реформировать – промышленность, сельское хозяйство, здравоохранение, образование.

– С ваших слов выходит, что буквально все надо менять?

– Именно! В современном мире синонимом успеха является постоянная готовность к переменам – и самого человека, и общества, и государства.

«Надо сесть за стол переговоров с российскими партнерами и провести ревизию союзного договора»

– Действующий президент на днях четко сказал: страну таким, как вы, да и вообще никому он не отдаст.

– Это что, его вотчина? Он приватизировал эту страну? Нет! Он не бог, не царь и даже не герой. Он такой же гражданин Республики Беларусь, как и каждый из нас. По Конституции, источником власти является белорусский народ. Если он ему скажет «хватит», он обязан будет уйти.

– С одной стороны, есть источник власти – белорусский народ, а с другой – все видят задержания политиков и активистов. Как вы побеждать собираетесь, я не понимаю.

– Давайте посмотрим, как будут реагировать на результаты выборов армия и милиция. Они ведь офицеры, давали присягу народу, а не конкретному индивиду. Мы уверены, что у них есть и честь, и мужское достоинство. Но самое главное – они сами живут в обществе, у них есть родители, жены, дети. И они тоже видят, что общество стало другим, что все хотят перемен, хотят свободно заниматься бизнесом, не опасаясь попасть за это в тюрьму. Пока давайте двигаться вперед в политическом процессе. Мы действуем строго в соответствии с Конституцией и избирательным законодательством.

– Блогер Сергей Тихановский до его ареста говорил мне в интервью, что придется выходить на улицу, потому что бы уверен, что выборы честными не будут. Насколько к улице готовы вы и в каких ситуациях вы допускаете для себя возможность призвать людей на улицу?

– Я не буду призывать. Но если это будет инициатива самих людей, то я, безусловно, буду присутствовать на акциях. Но, надеюсь, этого не потребуется, и мы цивилизованно закончим эту кампанию.

– Вы коснулись отношений с Россией. Москва с 2018 года ставит вопрос углубления интеграции с Беларусью в рамках договора о Союзном государстве. У вас какой взгляд на этот вопрос?

– В договоре есть экономическая, политическая и социальная части. По экономической части мы получали энергоносители по цене Смоленска. Это был жест доброй воли со стороны России. Пока были высокие цены на энергоносители и была ситуация для России конъюнктура, можно было дотировать Беларусь. Но сейчас, с падением цен на энергоносители, Россия должна думать о том, как выполнять свои социальные обязательства, а не дотировать другое государство.

Экономический раздел работал, а вот с политическим были проблемы. Там содержатся положения о единой валюте, общем парламенте, суде.

Мне кажется, нам надо сесть за стол переговоров с российскими партнерами и провести ревизию союзного договора, который был заключен в совершенно другую эпоху.

Смысл ревизии должен состоять в том, чтобы посмотреть, чего мы достигли, какие направления мы должны развивать, а на каких вопросах не стоит акцентировать внимание. Я убежден, что мы сможем найти общий язык с руководством Российской Федерации. Самое тесное и эффективное сотрудничество возникает там, где есть совпадение взаимных интересов двух договаривающихся сторон.

– Другой претендент на пост президента, Виктор Бабарико, говорил мне, что хотел бы видеть Беларусь нейтральной страной. По сути, вывести из ОДКБ. У вас какой подход? Надо оставаться в этом альянсе или лучше взять курс на внеблоковый статус?

– Я считаю, что мы обязаны соблюдать международные обязательства, взятые на себя ранее, в том числе наше участие в ОДКБ. Тем более что я в этом не вижу никаких проблем для суверенитета Беларуси. Этот альянс не несет угроз национальной безопасности ни Беларуси, ни наших соседей. Это понимают и наши западные партнеры, с которыми мы хотели бы развивать отношения, прежде всего торгово-экономические.

В свое время у Финляндии с Советским Союзом был Договор о дружбе, сотрудничестве и взаимопомощи. Он никак не мешал этой стране вести политику нейтралитета и даже провести у себя первое совещание по безопасности и сотрудничеству в Европе.

Мы, безусловно, будем развивать отношения со странами Запада, активизируем их, реанимируем договоренности и договоры, которые были заморожены из-за внутриполитической ситуации в Беларуси. Стратегически же, я убежден, мы должны сконцентрироваться на том, чтобы приводить в порядок нашу страну, делать ее экономику эффективной, инвестклимат – более привлекательным, не делая разницы по поводу того, откуда приходит инвестор – из России или США.

– Вы понимаете, зачем президент сейчас сменил премьер-министра? Что это было?

– Трудно сказать. Ни одно правительство за два месяца не сможет показать никаких результатов работы. И это в том числе. У нас с точки зрения полномочий правительство почти ничего не решает. Тем более что, согласно Конституции, если Лукашенко надеется на чудо, что его переизберут, то правительство должно будет автоматически подать в отставку. Поэтому не знаю, зачем он его сейчас сменил. Не вижу никакого смысла.

– По поводу чуда в виде переизбрания Лукашенко я понимаю, что любой кандидат должен говорить о своей победе и о том, что оппоненты будут повержены. Но большинство наблюдателей сходятся в том, что Лукашенко после выборов сохранит власть. Если это произойдет, то каким образом, как вы думаете, будет происходить транзит власти в Беларуси? Ведь должен он когда-то начаться.

– Он давно должен был осуществить транзит, потому что народ от него устал. Но Лукашенко не доверяет никому. Если он хочет нормально остаться в истории, то должен осуществить транзит власти цивилизованно, то есть посредством демократических выборов. Иными словами, передать власть тому, кто наберет больше голосов в результате всенародных выборов.

Он неоднократно говорил, что если за него не проголосуют люди, если он потеряет популярность, то уйдет. Он клялся в этом много раз. Сейчас у него есть возможность выполнить эту клятву, данную белорусскому народу.

Пришло время сделать выборы такими, чтобы ни у кого не оставалось сомнений в их открытости и честности.

Пусть победит тот, с кем белорусский народ захочет строить свое будущее.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Ці ж апараты вінаваты, што хтось застаўся без зарплаты?

33-гадовы мінчук пасля пройгрышу разбіў экран гульнявога апарата, пашкодзіў сцяну і стойку для флаераў. Асобу хулігана выдічылі хутка, бо ён быў заўсёднікам гульнявой установы. Узбуджана крымінальная справа.

Як гуляеш ты на грошы,
Дык звычайна ў той гульні
Вынік дужа нехарошы –
Проста божа барані!
Для цябе запал гульнёвы
Стане дозай наркаты,
І лічы, што безгаловы, –
Розум, братка, страціш ты.
І мінчук хваробу тую
Падхапіў, на жаль, даўно.
Кожны дзень бядак прастуе,
Як у пашчу, ў казіно.
Аддае парой зарплату
Да апошняга рубля
Ненажэру-апарату,
Галадаючы пасля.
Для сям'і таксама драма –
Жыць на хлебе і вадзе.
Вельмі цяжка, скажам прама,
Памагчы ў такой бядзе.
А сябры яму казалі,
Ушчувалі, як маглі:
– Не на тое ў гэтай зале
Траціш кроўныя рублі.
Лепш бы ты патраціў сродкі
На гулянкі, на прапой,
Дык і мы хоць чарку ўсё-ткі
Часам выпілі б з табой;
Ці аддаў бы іх путане…
Ды сябрам адказваў ён:
– Вам зайздросна потым стане,
Калі выйграю мільён!
Акуплю адразу страты!
Ён з упартасцю асла
Соўгаў грошы ў апараты,
Толькі ўдача не ішла.
Як мінчук у раз чарговы
Грошай страціў надта шмат,
Дык прыйшоў ён да высновы
(Што паробіш? Безгаловы!):
Вінаваты апарат,
Што не дружыць ён з удачай,
Што зыход такі благі;
У машыны той, няйначай,
Чалавечыя мазгі.
«Чалавеку-апарату»
Злосна выгукнуў:
– Махляр!
І нагою супастату
Ён у «твар»
Нанёс удар.
Біў зламысніка й рукамі,
Хук ужыў і аперкот,
Бо кулак яго – як камень,
Як каваны ў войску бот.
А якога ж рэзультату
Змог усё ж дабіцца ён?
Прайдзісвету-апарату,
Так сказаць, зрабіў гамон.
Ды другім гульцам ва ўгоду
Будзе новы апарат.
А мінчук за тую шкоду
Не пазбегне іншых страт.
***
Меркаванне ёсць такое:
Мо б направіў розум свой,
Калі б біў ён не рукою,
А дурною галавой?..

Гонар і шчасце

Мужчынскі гонар,
Што ты ні кажы, –
Не тое, што ў штанах, а ў гаражы.
А тое, што ў штанах
Для палкай страсці, –
Сапраўднае
Тваёй жанчыны шчасце…

Уважлівы жанчыну

– Ды я жанчына, абармот! –
Пачуў ад маладзіцы ён,
Таму саломінку і лёд
Рашыў дадаць у самагон…

«Верная»

– Мой муж такі ўжо лавелас,
Што проста не хапае зла!
А я ж яму, казлу, не раз
З другімі вернаю была…

Сапраўдная бяссонніца

Прызнаць бяссонніцу гатоў
Бясспрэчна, несумненна,
Калі авечак, бараноў
Ты ведаеш пайменна.

Грамадзянскі шлюб

Пра грамадзянскі шлюб
Скажу я так:
Жанчына замужам,
Мужчына – халасцяк.

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО

Игорь РЫНКЕВИЧ

Пока не поздно

Слово к офицеру милиции Владимиру Козловскому

Меня тяготит история с офицером милиции Владимиром Козловским, который в дороге мне Гродно стал участником спланированной спецслужбами провокации против блогера Сергея Тихановского. Вся страна увидела, как на пикете после спектакля, исполненного актрисой позорного поведения, на сцену улегся он, Козловский, а затем беспомощно и бездарно разыграл боль от «ушиба». Вскоре ему и еще одному офицеру Александру Хвалене предстоит в суде стать главными драматическими фигурами – потерпевшими от насилия мирных граждан.

Будучи адвокатом, я насмотрелся милицейских свидетельств, полных цинизма и обмана. Но никак не могу привыкнуть к их казарменной лжи, попранию чести мундира, уничтожению в угоду автократии прав граждан и их судеб.

Вот сейчас мне вспомнилась повесть Александра Куприна «Поединок».

Лучше всего об этом ее автор сказал словами одного из героев, талантливого, но спившегося офицера Назанского: *«…Если рабство длилось века, то распадение его будет ужасно. Чем громаднее было насилие, тем кровавее будет расправа. И я глубоко, я твердо уверен, что настанет время, когда нас… станут стыдиться женщины и, наконец, перестанут слушаться солдаты. И это будет не за то, что мы били в кровь людей, лишенных возможности защищаться, и не за то, что нам, во имя чести мундира, проходило безнаказанным оскорбление женщин, и не за то, что мы, опьянев, рубили в кабаках в окрошку всякого встречного и поперечного. Конечно, и за то и за это, но есть у нас более страшная и уже теперь непоправимая вина. Это то, что мы – слепы и глухи ко всему. Давно уже где-то вдали от наших грязных, вонючих стоянок совершается огромная, новая, светозарная жизнь. Появились новые, смелые, гордые люди, загораются в умах пламенные свободные мысли… А мы, надувшись, как индейские петухи, только хлопаем глазами и надменно болбочем: «Что? Где? Молчать! Бунт! Застрелю!» И вот этого-то индюшечьего презрения к свободе человеческого духа нам не простят – во веки веков!»*

Увы, к сожалению, в неосоветской Беларуси при власти Александра Лукашенко многие офицеры армии, милиции, спецслужб, все эти нынешние козловские, недалеко ушли от такого же презрения к свободе народа, правам граждан.

Беларусь знает и помнит своих антигероев, которые убивали бывших руководителей МВД Юрия Захаренко и Центризбиркома Виктора Гончара, которые избивали экс-кандидата в президенты Александра Козулина, совершали иные гнусные деяния. Эти сотрудники органов внутренних дел навлекли такой же силы позор на репутацию милиции, как и «пострадавший» спецназовец Юрий Давидович, ударивший со всей дури кулаком по лицу Светлану Завадскую, стоявшую с портретом исчезнувшего мужа на центральной площади столицы у «нулевого километра»…

Вскоре офицерам милиции, «потерпевшим» от насилия Сергея Тихановского и его сторонников, предстоят очные ставки, ибо показания сторон о гродненском пикете противоречат друг другу. Но важнее для Козловского и сослуживцев окажется очная ставка со своей совестью: ведь офицерам с этим придется жить дальше.

Не проще ли отказаться от надуманных показаний против народного блогера?! Я мог бы предложить Владимиру Козловскому встретиться с Сергеем Тихановским на мирных переговорах, но не я буду проводить такую медиативную сессию. Ибо я уже не беспристрастен, на сей раз не могу сохранить нейтралитет ко лжи, трусости и бесчинству…

Про очереди мирных граждан в пикетах альтернативных претендентов в президенты нынешний правитель заявил: *«Мы не должны допустить, чтобы разного рода шайки и банды уголовников бродили по стране с засученными рукавами: люди, не дай бог, подумают, что гестапо вернулось, война началась. Вот этого мы допустить не должны. И я этого не допущу... Я уже военным говорил: один буду против них сражаться, если надо. Хотя у нас хватает людей в погонах, которые способны защитить свою страну. Они понимают, что в этой стране жить их детям».*

Но большинство белорусских граждан не верят этому и другим публичным заявлениям Лукашенко. Это в конце прошлого века можно было избить тракториста в совхозе, и никто бы ничего не доказал. Теперь каждый гражданин может снять мобильным телефоном видеосвидетельство, доказывающее провокации и преступления силовиков. Сейчас граждане записывают историю репрессивных действий властей, чтобы будущему суду было понятно, кто же на самом деле бесчинствует на улицах Беларуси.

Я обращаюсь не только персонально к Владимиру Козловскому, мое «Слово» ко всему «полку козловских»: в каких бы органах вы ни проходили службу, перемены в Беларуси грядут неумолимо, и еще не поздно каждому человеку в погонах вспомнить о чести, о присяге не правителю, а своему народу и Беларуси.

Память народная о служебных нарушениях, преступных деяниях не обнулится. Нет срока давности у преступлений против человечности, против свободы своего народа. Имена таких сотрудников силовых служб внесены в базы правозащитников о жертвах политических репрессий в Беларуси. И если граждан с попранными правами новая власть реабилитирует, пусть и посмертно, то должностным лицам, их преследовавшим, придется нести ответственность. Одумайтесь, пока не поздно!

Мне уже приходилось 18 декабря 2019 года апеллировать к вам через открытый «Зварот да супрацоўнікаў міліцыі, войска і спецыяльных службаў Беларусі аб абароне незалежнасці Рэспублікі Беларусь». Тогда перед опасностью аншлюса белорусского государства со стороны путинской России мы с коллегами-патриотами призвали вас не выполнять преступные приказы.

Мы призывали не разгонять гражданских лиц, не задерживать их, не принимать участия в провокациях против мирных протестующих, не препятствовать своим соотечественникам осуществлять конституционные права. Но власть позднее ответила беспрецедентным валом административного преследования в судах, в основе которого были протоколы и показания работников милиции.

Декабрьское Обращение первым подписал подполковник милиции запаса Николай Козлов. Это тот подполковник, который на выборах в 2008 году честно пресек нарушение закона одним из членов участковой комиссии. Извините за каламбур, но лейтенанту Козловскому еще не поздно взять пример мужества с подполковника Козлова.

Надеюсь, что к вам, своим сослуживцам, также обратятся генерал милиции Мечислав Гриб, военный полковник Владимир Бородач, майор КГБ Валерий Костка, другие достойные офицеры да и цивильные люди с призывом соблюдать конституционную законность, правовые законы и права белорусских граждан.

Сотрудники милиции, армии, спецслужб! Мы, граждане Беларуси, ждем, что вы перестанете участвовать в репрессиях, лжесвидетельствовать в суде, охранять на избирательных участках преступные фальсификации, исполнять преступные приказы, поддерживать диктатуру.

Вашим детям под белорусским небом жить с нашими детьми. Милиция, армия должны быть с белорусским народом в стремлении к прогрессу, демократии, благополучию. Ибо если с нами Бог, правда истории, то кто может посметь быть против нас?!

P.S. *Письмо Игоря Рынкевича печатается с сокращениями. Полный текст – на сайтах.*

Об авторе

Родился 3 апреля 1968 года в Гродно. В 1985 году окончил гродненскую школу №3 с золотой медалью и поступил на истфак Гродненского госуниверситета (ГрГУ). После первого года обучения в ГрГУ отслужил два года в Вооруженных силах СССР. Окончил в 1992 году ГрГУ по специальности «история» с квалификацией «историк, преподаватель истории и социально-политических дисциплин» с отличием. Также с отличием завершил в 1998 году в ГрГУ второе высшее образование по специальности «правоведение» с квалификацией «юрист». Работал учителем истории в средних школах Гродно, преподавателем права в столичных вузах, юрисконсультом на предприятиях Минска. В 1999–2007 годах работал адвокатом, но под давлением властей был вынужден покинуть адвокатуру из-за активной защиты Александра Козулина, кандидата в президенты на выборах 2006 года. В последние годы преподавал юридическую конфликтологию. Работает медиатором. С 1989 года активно занимается общественно-политической, правозащитной деятельностью. Православный.

ПАМЯЦЬ

Як паўстанка Эмілія Плятэр дапамагла знайсці магілу загінуўшага ў 1944-м Антона Гусарэвіча

Свайго дзеда Гусарэвіча Антона Міхалаевіча я не ведала. Ён быў прызваны ў дзейную армію ў ліпені 1944 года. Ляжаў у руінах толькі што вызвалены Мінск, жыхары невялікай дзедавай вёскі Затычына знослі і звозілі ў брацкую магілу целы байцоў 352-й стралковай дывізіі, што вызваляла прысталічныя землі. Арміі патрэбны былі свежыя сілы, бо вызваленчая вайна працягвалася. Дзеду было 49 гадоў…

А недзе праз месяц прыйшла пахаронка. На руках у Альжбеты Гусарэвіч, па-вясковаму Антонікі, засталося чацвёра дзяцей. Самай старэйшай, Марыі, маёй будучай маці, толькі споўнілася васямнаццаць. У цяжкіх пасляваенных буднях і клопатах пра хлеб надзённы тая пахаронка недзе згубілася. Але ў калектыўнай памяці ўсіх Гусарэвічаў засталося месца пахавання бацькі – пад Сувалкамі.

Калі мне захацелася тое месца адшукаць, я не магла ўявіць, што гэтыя пошукі расцягнуцца амаль на цэлы год. І што шукаць магілу дзеда дапаможа… Эмілія Плятэр. Легендарная ўдзельніца паўстання 1831 года, беларуская Жанна д'Арк.

Першым маім крокам стала наведванне ваенкамата Мінскага раёна, дзе я атрымала копію пасведчання аб смерці А.Гусарэвіча, дасланага з палявога шпіталя №564. Той самай пахаронкі, страчанай у пасляваенны час. Месцам смерці значылася «Сувальская вобласць», але напісанні паселішча мелі рознастанні. Праз пэўны час назву вёскі, дзе 11 жніўня 1944 года памёр ад хваробы чырвонаармеец Антон Гусарэвіч, удалося ўдакладніць. Па-руску пісалася *Копцово*. Засталася знайсці яго на карце.

Для сучаснага чалавека назва «Сувалкі» асацыюецца найперш з Польшчай. Таму і я доўга шукала вёску Копцава на паўночным усходзе краіны-суседкі. Вынікаў не было. Звярнулася ў Беларускі Чырвоны Крыж, адкуль адказалі, што пошукавая праца можа доўжыцца больш за год.

Неяк я набрала на клавіятуры іншы варыянт назвы – *Капцёва*. І цуд! Адразу знайшлася вёска Капцёва, размешчаная на беларуска-польска-літоўскім памежжы. Сёння яна знаходзіцца ў Лоздзеўскім раёне Літвы і называецца… *Karčiamiestis*! Трапіла ж мясціна ў электронныя даведнікі невыпадкова – тут у 1831 годзе на каталіцкіх могілках знайшла свой апошні прытулак 25-гадовая паўстанка Эмілія Плятэр. Прыгожы помнік ёй са словамі Адама Міцкевіча на пастаменце ўзвышаецца ў цэнтры вёскі.

Так нечакана перакрыжаваліся жыццяпісы радавога Антона Гусарэвіча і капітана Эміліі Плятэр. Магіла дзеда нарэшце знайшлася. Трэба было належным чынам ушанаваць яго памяць. Я напісала ліст старасту таго Капчамесціса. Адказ мяне адначасова і ўзрадаваў, і засмуціў. Спадар Відмантас Дамбраўскас паведамляў, што ў канцы вайны побач з іх вёскай сапраўды знаходзіўся франтавы шпіталь. Памерлых байцоў хавалі ў брацкай магіле. На адным з абеліскаў ён знайшоў прозвішча *Гусарэвіч*, але з ініцыяламі «*П.А.*». Значыць, кропку ў пошуках ставіць было яшчэ рана.

Зноў вывучаю дакументы. Высвятляецца, што сярод 62 воінаў з прозвішчам *Гусарэвіч*, якія загінулі, памерлі ці зніклі без вестак у час Вялікай Айчыннай вайны, няма ніводнага з ініцыяламі «*П.А.*». Заадно даведваюся, што ў адзін дзень з маім дзедам у шпіталі памерлі яшчэ трое: *Зільман Георгій*, *Чудзіновіч Іван* і *Рамашэўскі Фёдар*. Зноў пішу ў Капчамесціс. На гэты раз адказ з Літвы быў амаль што прадказальным. У спісах пахаваных стараста знайшоў Чудзіновіча і Рамашэўскага (таксама з пабытанымі ініцыяламі).

Што ж, памылкі здараюцца нават на абеліскаў. Праўда, не заўсёды іх хочуць прызнаваць. На жаль, амбасада Літвы палічыла недаказаным наша сваяцтва з Гусарэвічам П.А. і адмовіла нам у выдачы бясплатных віз. Таму, каб наведаць магілу дзеда, мы мусілі аформіць статус турыстаў…

Улетку 2019 года Антон Гусарэвіч «вярнуўся» на радзіму, у сваю вёску – у выглядзе жывапіснага партрэта, напісанага яго праўнучкай Паўлай Кароткай. Палатно нават экспанавалася на Рэспубліканскай мастацкай выставе, прысвечанай 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Цяпер «намолены» сотнямі вачэй удзячных нашчадкаў у мінскім Палацы мастацтва партрэт дзеда Антона стане родавым абярэгам майго бацькоўскага дома.

Тамара КАРОТКАЯ.
Мінск

ПОЗДРАВЛЯЕМ!



Директор ЗАО «Нива» Шкловского района Григорий Ковалев удостоен звания «Заслуженный работник сельского хозяйства».

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Куда сообщать о нарушениях?

«В одном из минувших номеров «Народной Воли» была напечатана Декларация о честных выборах, которую предложил претендент на президентский пост Виктор Бабарико. Но я так и не понял, куда обращаться, если мне станет известно о фактах нарушения законодательства или о том, что кого-то заставляют подписаться за какого-то кандидата?»

Виктор ИВАНОВСКИЙ, Минск.

Виктор Бабарико предлагает писать жалобы сразу в Центризбирком.

«Если Вам стало известно о фактах нарушения избирательного законодательства, в том числе о случаях подкупа или давления на избирателей, об участии администрации предприятий или использовании должностного положения при сборе подписей избирателей, заполните прилагаемую форму жалобы в ЦИК с подробным описанием известного Вам нарушения и направьте ее по адресу: ул.Советская 11, Минск 220010», – говорится на сайте Виктора Бабарико.

Примерную форму обращения в ЦИК можно скачать на сайте *babariko.by*.

Вера ВИР.

ХАЧУ СКАЗАЦЬ...

Калі мэта Беларусі – стаць нейтральнай дзяржавай, то пра якую ядзерную праграму можа быць гаворка?

Літаральна днямі вычытаў на адным сайце, што хтосьці з вышэйшых эшалонаў улады выказвае ідэю наконт ядзернай праграмы. Маўляў, нам не хапае толькі такой зброі.

Калі гэта не фэйк, то людзей, у галовах якіх сапраўды круцяцца такія думкі, трэба тэрмінова накіраваць да псіхіятраў. У нашай Канстытуцыі прама запісана: Беларусь ставіць на мэту стаць нейтральнай дзяржавы. Гэта раз. А па-другое, увязвацца ў ядзерную гонку – значыць канчаткова падарваць эканоміку, давесці людзей да жабрацтва.

Хто нам пагражае, з кім трэба спаборнічаць? У вялізнай суседняй Расіі 4300 ядзерных боегаловак, у Злучаных Штатаў Амерыкі – 3800. Навошта нам хоць адна з іх?

Наша мэта – ні з кім не ваяваць, а з усімі сябраваць!

Рыгор КАПУЦКІ, сталы чытач «Народнай Волі».

РЭЗАНАНС

Дакуль ЖКГ будзе рабаваць беларускіх мастакоў?

Пасля прачытання ў «Народнай Волі» за 29 красавіка артыкула Міхала Карневіча не магу ўстрымацца, каб не напісаць пару слоў пра тое, як сёння жывуць беларускія мастакі.

Напрыклад, Валянціна Шоба – легенда сучаснага жывапісу, адзначаная на самых прэстыжных выставах у Парыжы, – засталася практычна без сродкаў да існавання, паколькі ўсе тыя сродкі ідуць на арэндную плату за майстэрню. І ў падобным становішчы апынулася многія мастакі.

Я пенсіянер. Арандую майстэрню ў Віцебску, на дзясятым паверсе шматпавярховіка. Плошча майстэрні – 47 квадратных метраў. Побач майстэрня (80 «квадратаў») вядомага жывапісца Алега Скавародкі, узнагароджанага медалём Францыска Скарыны. Ён таксама ўжо на пенсіі.

У нас у Віцебску існуе практыка: ЖКГ падчас ацяплільнага сезона здымае лічыльнікі (агульныя на дом) – для «прафілактыкі і рамонту». І што атрымліваецца? За люты я заплаціў за ацяпленне (толькі за ацяпленне!) 118 рублёў, а за сакавік – ужо 178 рублёў!

Чаму пасля пераўсталявання лічыльніка рэзка вырасла плата? Чаму ацяпленне для мастака каштуе ў пяць з паловай разоў больш, чым для жыхароў дома? Нахабства ЖКГ проста зашкальвае! А ёсць жа яшчэ плата за капрамонт, за электрычнасць, за ваду і г.д.

Наш Саюз мастакоў змагаўся і змагаецца з чыноўнікамі, але беспаспяхова. Мастацкія галерэі зачынены. Іх таксама ЖКГ абула ў лапці. Дзе нам прадаваць свае працы, каб зарабіць на жыццё?

Побач з маёй майстэрняй дзве майстэрні пустуюць: мастакі-пенсіянеры ад іх адмовіліся – не могуць аплаціць.

Праз «Народную Волю» звяртаюся ў Камітэт дзяржаўнага кантролю. Дапамажыце, разбярыцеся з чыноўнікамі, якія выйшлі з-пад усялякага кантролю. Да якой пары ЖКГ будзе нас рабаваць?

Аляксандр ШЫЁНАК.
Віцебск.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
12 ЧЭРВЕНЯ 2020 г.

АКТУАЛЬНЫЙ ВОПРОС

В каких странах безопаснее отдыхать?

Португалия, Турция и Саудовская Аравия оказались в числе первых стран, которые внедрили протоколы безопасности, подготовленные Всемирным советом по туризму и путешествиям. В заявлении организации отмечается, что соответствующая сертификация должна помочь путешествующим выбрать такое место отдыха, где будут соблюдаться международные стандарты гигиены и здравоохранения.

Протоколы безопасности, о которых идет речь, были одобрены Всемирной туристской организацией ООН. Они призваны, помимо прочего, вернуть доверие потребителей, подорванное коронавирусной пандемией. Программа сертификации распространяется на гостиницы, рестораны, аэропорты, круизные лайнеры и общественный транспорт. Протоколы безопасности разработаны также для туроператоров и магазинов.

Как следует из официального сообщения, Всемирный совет по туризму и путешествиям сертифицирует страны, отдельные регионы и города. Так, среди популярных европейских направлений упомянуты Мадрид, Севилья и Барселона. В списке стран, внедривших эти правила, организация выделяет Турцию, Болгарию, Португалию, Ямайку, Республику Маврикий и Саудовскую Аравию. Объявлено также о сертификации канадской провинции Онтарио, мексиканских штатов Нижняя Калифорния и Юкатан.

Как отмечают во Всемирном совете по туризму, с возобновлением туристической деятельности эти списки будут пополняться новыми безопасными для путешествующих направлениями.

А КАК У НИХ?

Латвия будет бесплатно тестировать на COVID-19 всех желающих

В Латвии государство обеспечит всех желающих бесплатным тестом на коронавирус.

Расширение тестирования (сдать тест смогут даже те, у кого нет симптомов заболевания) связано с отменой чрезвычайной ситуации. Тестирование должно позволить вовремя выявить вспышку заболевания.

Для того чтобы пройти бесплатный тест на коронавирус, необходимо заранее записаться на анализ.

Если у человека нет симптомов заболевания, то прибыть в пункт забора анализов можно на велосипеде, пешком или, используя маску, в общественном транспорте. При наличии симптомов необходимо позвонить семейному врачу.

ВІРТУАЛЬНЫ ВЕРНІСАЖ

Дарогай Караля Вайтылы

З нагоды 100-й гадавіны з дня нараджэння Яна Паўла ІІ Польскі інстытут у Мінску разам з Галерэяй плаката ў Кракаве запрашае пазнаёміцца з віртуальнай выставай плаката пад назвай «Дарога... Караль Вайтыла / Ян Павел ІІ – у польскім тэатральным і памятным плакаце», прысвечанай літаратурнай творчасці Караля Вайтылы – Яна Паўла ІІ.

Выставу складаюць выбраныя плакаты з аб'ёмнай калекцыі работ, звязаных з Вялікім Палякам. Калекцыя Кшыштафа Дыда налічвае іх больш за сто. У асноўным гэта мастацкія працы, створаныя найлепшымі польскімі плакатыстамі да тэатральных ці кінападзей. Ёсць таксама інфармацыйныя плакаты, звязаныя з публікацыямі, разнастайнымі сустрэчамі і мерапрыемствамі.

Плакаты былі створаны ў перыяд з 1979-га па 2011 год. Найстарэйшы з іх – аўтарства Вальдэмара Свежага да фільма пра Святога Айца Яна Паўла ІІ «Пілігрым». Наступны пасля яго – плакат Мечыслава Гуроўскага да прэм'еры спектакля паводле п'есы Караля Вайтылы «Брат нашага Бога».


Ян Павел ІІ (Караль Вайтыла) у часы сваёй маладосці быў чалавекам тэатра. Пяць яго п'ес ставіліся ў Польшчы на прафесійных сцэнах больш за 30 разоў. Плакаты да іх стваралі найлепшыя польскія мастакі-плакатысты: Францішак Старавейскі, Ян Ярамір Алексюн, Гжэгаж Маршалак, Лех Маеўскі, Анджэй Пангоўскі. П'еса «Брат нашага Бога» атрымала кінематаграфічнае ўвасабленне ў фільме Кшыштафа Занусі. Плакат да фільма стварыў Марэк Паўлоўскі.

Прадстаўленыя на вернісажы плакаты ўжо ўдзельнічалі ў выставах у Польшчы і за яе межамі, у тым ліку ў Швецыі, Харватыі і Германіі. Найбуйнейшая выстава адбылася ў 2013 годзе ў Мысляніцах (Польшча). Плакат да яе стварыў Себасцьян Кубіца. На прэзентаванай выставе ёсць работа і прадстаўніцы маладога пакалення Патрыцыі Лангава.

Польскі інстытут у Мінску ў сувязі з неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыяй цалкам пераносіць сваю дзейнасць у віртуальную прастору. У сувязі з гэтым запрашаем сачыць за інфармацыяй і падзеямі на нашым сайце і на старонках у сацыяльных сетках.

Галіна РУТ.

ОТДЫХ-2020



Как полететь в Турцию?

В июле «Белавиа» пополнит свой график полетов турецкими маршрутами.

Консолидатор чартерных рейсов, оператор «АэроБелСервис» объявил свою полетную программу в Турцию:

– Анталия из Минска – с 1 июля, из Гомеля – с 10 июля,

– Бодрум – со 2 июля,

– Кушадасы – с 3 июля.

Также свою полетную программу в Турцию объявил туроператор «Тез Тур»:

– Анталия из Минска, Бреста, Витебска, Гродно – с 4 июля,

– Кушадасы – с 4 июля.

На сегодняшний день Турция объявила, что готова принимать туристов по «смягченной схеме», то есть предварительно полученных справок об отсутствии коронавируса от туристов не потребуется, информирует *www.toursoyuz.by.*

Зато во всех аэропортах турецкие власти открыли специальные «тест-центры».

Каждому гостю по прилете будут измерять температуру. Если она окажется выше 38 градусов, то туриста ждет тест PCR, который показывает результат в течение часа.

Как заявил министр культуры и туризма Турции **Мехмет Эрсой,** страна приняла беспрецедентные меры, направленные на обеспечение безопасности отдыхающих – в аэропортах, отелях, ресторанах и на пляжах.

Социальная дистанция в Турции составит 1,5 метра между местами в лобби отеля, между столиками в ресторанах, в аэропорту и в очередях за едой на шведском столе.

Шведский стол в некоторых турецких отелях остается, но в несколько измененном виде. Так, еду на шведской линии отдыхающим будут накладывать официанты. И сами гости должны будут выдерживать дистанцию в полтора метра друг от друга. Такое же расстояние установлено для пляжных шезлонгов.

В части турецких отелей шведские столы демонтированы. Горячее и закуски туристам раздает персонал в традиционной посуде, а овощи и фрукты – в одноразовой.

На входах в отели Турции уже установлены автоматизированные тепловые камеры – для измерения температуры как постояльцев, так и сотрудников отелей. Введена особая мера по дезинфекции багажа прибывающих туристов.

В целом очевидно, что отдых этим летом, в том числе и в Турции, немного изменит привычный ритм. Как подчеркнул Мехмет Эрсой, «*такое будет впервые в истории мирового туризма*».

ЕСТЬ ВОПРОС!

Что будет, если у туриста в турецком аэропорту поднимется температура и тест на коронавирус будет положительным?

На этот вопрос Республиканскому союзу туристических организаций ответили специалисты компании «АэроБелСервис»:

«Если тест будет положительным, туриста тут же отправят в турецкую больницу – страховка покрывает лечение от коронавируса.

Если же у туриста обнаружится температура выше 38 градусов, но при этом тест даст отрицательный результат, то такого человека поселят в специальную (отдельную) зону забронированного отеля».

Лилия КОБЗИК.

ДИПКУРЬЕР

Должность посла Германии в Словении впервые разделит супружеская пара

С августа посольство Германии в Словении впервые возглавит супружеская пара. Bild называет новое дипломатическое назначение удивительным экспериментом немецкого внешнеполитического ведомства.

Юристы **Натали Каутер** и **Адриан Польман** работают в МИД Германии с 2005 года. У них уже есть опыт совместной работы: несколько лет они делили должность заместителя немецкого посла в Сараеве.

Супруги решили совместить переезд в чужую страну с заботой о своих детях (7, 8, 10 лет). Именно поэтому пара убедила министра **Хайко Мааса** и менеджеров по персоналу испробовать неординарный подход.

С августа супруги в течение четырех лет будут заниматься посольской деятельностью в Любляне – столице Словении. Адриан Польман будет послом первые восемь месяцев, в течение которых семьей будет заниматься его жена; следующие восемь месяцев посольские обязанности будет исполнять Натали Каутер. Затем супруги снова поменяются ролями.

При этом пара выступает за жесткое разделение времени на семью и на рабочие обязанности. Например, если один из партнеров заболеет во время исполнения обязанностей посла, подменять его будет не супруг, а заместитель посла.

На общественных мероприятиях, где присутствует пара, оба будут выступать официальными представителями Германии.

ЗЕМЛЯКИ

«О возможности настоящей эпидемии вирусологи предупреждали еще в 2007 году»

*Биолог **Марина БОНДАРЕВА**, специалист в области молекулярной и клеточной биологии, регенерационной медицины, уже 16 лет работает в Германии. Еще до получения диплома о высшем образовании в минском Институте имени Сахарова, белорусская студентка выиграла стипендию в Институте имени Макса Планка в Дортмунде, что дало ей возможность поступить и закончить там аспирантуру. Так началась ее научная карьера в Европе. Сейчас Марина Бондарева занимается научным менеджментом в Институте диабета и ожирения в Helmholtz Diabetes Center (Мюнхен). А еще не могу не сказать и о таком факте: Марина – родная сестра нашей оперной звезды, солистки Большого театра Оксаны Волковой. Вот такие две личности выросли в одной семье!*



– Как вы думаете, почему Германия лучше всех прошла испытание пандемией? Что было определяющим: немецкий менталитет или организация медицинской помощи?

– Действительно, Германия неплохо справилась с эпидемией. Больше всего порадовало то, что госпожа Меркель при принятии сложных и непопулярных решений о карантине руководствовалась фактами, предоставленными наукой, и ставила главным приоритетом жизнь и здоровье людей. В такие моменты радует, что страной руководит человек с докторской степенью по физике, способный отличить факты от спекуляций.

Но есть и другие факторы, давшие Германии преимущество: высокое качество медицины, количество коек в реанимации на тысячу человек населения (значительно большее, чем в Италии и Франции), быстрое принятие решений об отмене мероприятий и закрытии школ, и, как вы справедливо заметили, менталитет – ответственность и солидарность, проявленные населением. Представьте себе такую степень доверия: когда заболеваемость неумолимо шла вверх, получить больничный у врача можно было просто по телефону! Эта мера позволила переболеть людям с легкими симптомами простуды (кашель, лихорадка) дома, а не ходить по врачам или на работу, заражая остальных.

– А как лично вы и ваша семья пережили жесткую «удалёнку»? Кстати, не поправились?

– Наша семья от «удалёнки» особо не пострадала, тем более режим был не такой уж жесткий: можно было гулять одному или с членами своей семьи на улице, заниматься спортом на свежем воздухе. Главное – не контактировать с другими людьми. Нам с мужем можно было работать из дома, старшая дочь (12 лет) занималась с учителями на дистанционном обучении. Младшему сыну (4 года) было тяжелее, поэтому он нас всех по очереди доставал, требуя хлеба и зрелищ. Спасала положение собака, которая стала отличной нянькой, и сад рядом с домом, куда можно выпустить ребенка играть, а самой рядом работать на свежем воздухе. Я поправилась где-то на килограмм, убеждаю себя, что это все мышцы!

– Нужно ли сейчас всем сдавать тест?

– Думаю, протестировать всех на наличие вируса – задача сегодня нереальная ни для одного государства. Тем более что это могло бы дать ответ на единственный вопрос: сколько людей инфицировано в данный момент времени? Но эта информация никак не поможет предсказать развитие заболеваемости в краткосрочной и долгосрочной перспективе, а также сделать выводы об иммунитете популяции. Учитывая максимальный объем тестов, которые лаборатории способны обработать в сутки, важно грамотно расставить приоритеты и тестировать людей с симптомами, их контакты, а также людей из групп риска, таких как медицинские работники.

– Как известно, природа стремится к балансу. Значит ли это, что иммунная система человека сама, без вакцины, через какое-то время сможет выработать защиту против коронавируса?

– Если у вас иммунная система в порядке, то после встречи с вирусом должен выработаться иммунитет, который препятствует повторной инфекции. Если вы молоды и не жалуетесь на здоровье, то, возможно, повезет переболеть бессимптомно.

– Бывает так, что в семье один человек – с положительным тестом на COVID-19, а другие – «чистенькие» (я лично знаю такие примеры). Вроде бы новый вид вируса, а у кого-то уже есть врожденная иммунная защита?

– Врожденного иммунитета к коронавирусу нет. Если в семье кто-то заболел с положительным тестом, а у других он отрицательный, этому могут быть несколько объяснений. Например, другие члены семьи переболели ранее бессимптомно, побороли вирус и приобрели устойчивость. Или они находятся в начальной стадии (инкубационном периоде), и вирус еще не выделяется в достаточном для положительного теста количестве. Но если люди живут вместе и постоянно контактируют, заражение неизбежно. Вирус передается не только при чихании и кашле, но и при обычном дыхании. По последним данным, вирус попадает в воздух вместе с выдыхаемыми микрокаплями воды и довольно долго циркулирует в закрытом помещении. Поэтому всем рекомендуют носить защитные маски.

– Вы работаете сейчас в Институте диабета и ожирения. Но в Германии это, кажется, не самая большая проблема, немцы ведь очень спортивная нация (одна сборная по футболу чего стоит, а еще пловцы и гимнасты).

– Доступность спорта не говорит о том, что люди находят для занятий им достаточно времени. Все-таки полежать на диване с печенькой – это приятно и помогает отдохнуть после рабочего дня. Да и со статистикой не поспоришь: за последние 20 лет количество мужчин и женщин с диагнозом «ожирение» увеличилось на 39 и 44 процента соответственно. Многие недооценивают масштабы бедствия, забывая о том, что лишний вес сопровождается серьезным нарушением обмена веществ и приводит к диабету, заболеваниям сердечно-сосудистой системы, печени, почек, опорно-двигательного аппарата. Все-таки за последние десятилетия условия жизни сильно изменились: доступность высококалорийного питания и гиподинамия – это наши реалии. Хотя в прошлом способность накапливать энергию в виде жировых резервов было однозначным эволюционным преимуществом, что помогало выживать.

– Пожалуй, ожирение в современном мире – тоже своего рода пандемия, охватившая все страны и континенты. Что на сегодняшний день считается эффективным средством против этой болезни?

– В лечении ожирения нет панацеи, необходим индивидуальный подход. Кто-то способен полностью сменить образ жизни и придерживаться новых пищевых привычек длительное время, но это большая редкость и требует гигантской силы воли. Кому-то подходит модное сейчас направление – интервальное голодание, хотя его эффективность доказана пока только на лабораторных животных. Несомненно, операция по уменьшению объема желудка является до сих пор одним из самых эффективных методов, но это крайняя мера. К ней прибегают, когда не помогает совсем ничего и риски для здоровья от ожирения несопоставимо больше, чем от осложнений после операции.

Эффективного и безопасного лечения для большинства пациентов на сегодняшний день не существует. Поэтому и ведутся исследования, для того чтобы понять причины и механизмы развития болезни. Например, одно из направлений в нашем институте – исследования мозга: именно там находятся центры регуляции аппетита и обмена веществ. Другая группа занимается изучением жировой ткани. Сегодня жировая ткань считается полноценным эндокринным органом, а не только теплоизолятором и депо энергии, как считалось ранее. Базовые исследования редко заканчиваются конкретным продуктом в виде препарата от лишнего веса. Наша основная цель – создание новых знаний о нашей биологии, которые позволят найти новые методы предотвращения и лечения заболевания. Но есть и группа, занимающаяся фармакологией – разработкой и тестированием препаратов, способных скорректировать нарушенный обмен веществ.

– Я знаю, что на Западе огромная конкуренция в научной среде. Это не давило на первых порах психологически?

– Как раз на первых порах учиться и работать в аспирантуре было хоть и трудно, в удовольствие благодаря поддержке коллег, моему руководителю и стимулирующей среде научного сообщества. По-настоящему жестко было работать в клинике в Мюнхене, где из неопытного «постдока» пришлось быстро стать руководителем группы, вести практические занятия для студентов-медиков, заниматься организацией лаборатории, писать заявки на гранты и при всем этом конфликтовать с начальством. Удовольствие так себе... Именно там я испытала и моральное давление, и конкуренцию во всей красе. Пыталась изменить ситуацию на месте, но место, к сожалению, явно не хотело меняться под меня. В итоге я ушла из клиники. Сейчас занимаюсь научным менеджментом в Институте диабета и ожирения в Helmholtz Diabetes Center – это, скорее, область организации науки. Моя задача – обеспечить финансирование наших исследований, обмен и коммуникацию между нашими партнерами из других стран, поиск перспективных молодых ученых и помощь им в достижении научных и карьерных целей.

– Скажите, пожалуйста, научными исследованиями на том уровне, который вам был предложен в Германии, у нас вы смогли бы заниматься?

– Я закончила Экологический институт имени А.Д.Сахарова по специальности «иммунология». Тогда еще он был независимым и очень прогрессивным, нас учили докапываться до причин заболевания, думать и экспериментировать. Говоря об уровне научных исследований двух стран, что толку сравнивать материальную базу? Понятно, что с финансированием науки в Беларуси беда. Но никакой уровень не имеет значения без людей с идеями и воображением. Убеждена, что в нашей стране много талантливых личностей. Но наука и свобода – это неразрывные категории. Если у ученого нет возможности самовыражаться, он, скорее всего, найдет эту возможность в другой стране.

– Как вы думаете, всемирный вирусный «перетряс» поспособствует развитию новых направлений иммунологии?

– Вряд ли коронавирус совершит революцию в иммунологии. Все-таки это стандартный микроорганизм, общие механизмы иммунного ответа известны. Все усилия направлены на создание вакцины. Но базовые исследования биологии вируса и его взаимодействия с хозяином могут задать интригу и привести не только к новым методам диагностики и антивирусной терапии, но и предсказать появление подобных эпидемий в будущем. Кстати, о возможности настоящей эпидемии вирусологи предупреждали еще в 2007 году. Так что можно было бы подготовиться, если бы угрозу восприняли всерьез тогда.

Елена МОЛОЧКО.

100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ

Хто каго перамог на Pobiedy Street?

Помніце, быў такі папулярны мультфільм «Прыгоды капітана Урунгеля»? Героі мульціка перад адпраўкай у кругасветнае плаванне прышрубавалі да борта яхты шыльду з назвай «Победа». Маўляў, як карабель назавеш – так ён і паплыве. Але яхта, ад залпа бутэлек з шампанскім атрымаўшы рэактыўную хаду, яшчэ ў гавані згубіла дзве першыя літары і выправілася ў мора-акіян як «Беда». А каманда таго не ведала і плыла, як на «Победе»…

Той вясёлы мультфільм успомніўся мне пасля навіны з маёй роднай Зэльвы пра вывешаныя ў райцэнтры двухмоўныя вулічныя шыльды. Мясцовыя ўлады скамандавалі напісаць іх на рускай і англійскай мовах. Шыльды атрымаліся вялікія, кідкія, вока міжволі за іх чапляецца. А зачапіўшыся вокам, моладзь аж падскоквае, каб на фоне тых надпісаў сэлфі зрабіць (сам бачыў). Аматарам сэлфі і на шпацыр, відаць, выйсці прыемна, сузіраючы такую відавочную далучанасць да заходняга свету. Тупаюць яны, скажам, па знаёмай змалку вуліцы Жэбрака, але ўжо з разуменнем, што дэфілююць па Zhebrak Street. А як экзатычна гучыць Pobiedy Street ці Sovietskaya Street – нават у лонданах і нью-ёрках такіх вуліц няма!

Што праўда, няма дазволу на гэткае самаўпраўства і ў беларускім заканадаўстве. У Законе «Аб найменнях геаграфічных аб’ектаў» (артыкул 17) чорным па белым напісана: «*У Рэспубліцы Беларусь найменні геаграфічным аб’ектам прысвойваюцца на беларускай мове, з якой спосабам транслітарацыі перадаюцца на рускую мову*». І ніякага выключэння для Зэльвы, хоць пад мікраскопам глядзі, у тым законе, зразумелая справа, няма.

Чым жа кіраваліся зэльвенскія ўлады, распісваючы няўцямнымі для мясцовых жыхароў «стрытамі» гарадскія дамы? Жаданнем наблізіцца да Еўропы? Але яна традыцыйна шматмоўная. Завабіць у Зэльву турыстаў з ЗША, Вялікабрытаніі ці Аўстраліі? А што яны будуць аглядаць, ходзячы па падмеценых «стрытах»? Помнік Леніну, злеплены заезджымі халтуршчыкамі? Пазасталыя з савецкіх часоў вагончыкі на беразе возера ў зоне адпачынку, з якіх і адназоркавых гатэляў пры ўсім жаданні не зробіш? Не чутно англамоўных турыстаў і на штогадовых Ганненскіх кірмашах, якія даўно ператварыліся ў дажынкі раённага маштабу.

Зэльву ва ўсёй Беларусі і ў блізкім замежжы ведаюць дзякуючы паэтцы Ларысе Геніюш, якая тут жыла і пахавана на мясцовых могілках. Але зэльвенскія ўлады палец аб палец не ўдарылі, каб хоць неяк ушанаваць яе памяць. Пішучы гэтыя радкі, я зазірнуў на сайт Зэльвенскага райвыканкама. Каго там толькі няма ў раздзеле «Славутыя жыхары раёна»! І польская пісьменніца з вёскі Пянюга ёсць, і спартсмены (далёка не алімпійскія чэмпіёны) у наяўнасці, і дызайнеру банкаў месца знайшлося. Геніюш сярод славутых жыхароў адсутнічае. Бо не ўпісваецца ў зэльвенскі ідэалагічны ландшафт, які ўяўляе з сябе дзіўны сімбіёз з руска-англійскіх шыльдаў і забытага ўсімі правадыра на пастаменце. Бо, жыві паэтка сёння, абавязкова запярэчыла б таму моўнаму манкуртызму на вулічных шыльдах, адкуль дэманстратыўна выдалена дзяржаўная беларуская мова. Дарэчы, да пярэчанняў Ларысы Геніюш ніколі не заставаўся абыякавым кіраўнік БССР Пётр Машэраў, стараўся прыняць меры, выпраўляў у Зэльву супрацоўнікаў ЦК КПБ, каб утаймавалі мясцовых начальнікаў у іх антыбеларускіх памкненнях.

Хто сёння ўтаймуе старшыню Зэльвенскага райвыканкама **Дзяніса Альшэўскага**, які, напляваўшы на закон, спрабуе выступіць заканадаўцам дзіўнай моды – пісаць вулічныя шыльды на чужаземных мовах? Абы дагадзіць замежнікам. Уявіце сабе: у Гродне вуліцы пачнуць надпісваць па-польску, у Брэсце – па-ўкраінску, у Ашмянах – па-літоўску, у Смалявіцкім раёне – па-кітайску… Проста вавілонская неразбярыха пачнецца.

На жаль, Зэльва ў агляднай будучыні не стане турыстычным аазісам, у райцэнтры праблем вышэй даху: адсутнасць прамысловых прадпрыемстваў, беспрацоўе, інвестараў туды ніякім дажынкавым кірмашом не завабіш. На фоне ўсяго гэтага вулічныя шыльды па-англійску выглядаюць як бязглуздая чыноўніцкая прыхамаць, як, гаворачы па-руску, *очковтирательство*. Толькі каму? Гэта ў адной з казак Андэрсена вецер перанёс шыльду з карчмы на тэатр, і гараджане валам павалілі на «новы спектакль» пад назвай «Суп з хрэна і фаршыраваная капуста». Вулічнымі шыльдамі (з хрэнам ці без) сёння народ не «нафаршыруеш».

Увогуле, як тое слова *Победа* на шыльдзе ні напішы, па-руску ці па-англійску, усё роўна *беда* ў ім чуецца і бачыцца. Як на борце той мульцяшнай яхты, што адчайна бедавала і ўрэшце патанула ў моры-акіяне.

Раней тая куртатая, як заечы хвост, Pobiedy Street мела шыльды на беларускай мове, і я памятаю, як мы, школьнікі, неслі па ёй гірлянду славы да мемарыяла героям Вялікай Айчыннай вайны. Неслі па вуліцы Перамогі. І адчувалі сябе спадкаемцамі дзядоў-пераможцаў. Чыім спадкаемцам адчуваеце сябе вы, Дзяніс Альшэўскі?

Можа, каб канчаткова не знясла віцца на ўсю Беларусь, прыбярыце ціхенька тыя шыльды-білінгвы – сведчанні вашай, скажам мякка, маладой нявопытнасці. Ну і ў наступны раз усё ж заглядвайце ў адпаведны закон перад тым, як шыльды на вуліцах мяняць.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Андрэй СТРЫЖАК: «Я на нагах перанёс каранавірус…»

Гомельскі праваабаронца і валанцёр распавёў “Народнай Волі”, чаму ён сёння знаходзіцца на каранціне.



Андрэй Стрыжак – адзін з арганізатараў кампаніі па зборы сродкаў і дапамозе медыкам, якія падчас каранавіруснай эпідэміі працуюць у дастаткова складаных умовах. Але ў выніку аказалася, што валанцёр і сам захварэў.

– Па меншай меры тыдзень пабуду ў ізаляцыі, каб не атрымліваць дадатковай віруснай нагрузкі і не аслабляць арганізм, – кажа Андрэй. – Хаця пра сваю хваробу даведаўся, можна сказаць, выпадкова.

Нашай камандзе, якая працуе з каранавіруснымі бальніцамі, бізнесмен Віктар Пракапеня перадаў тэсты на антыцелы. Я зрабіў тэст і прайшоў камп’ютарную тамаграфію, якая паказала, што ў мяне ёсць пнеўманія левага лёгкага. Таксама стала вядома, што ў абодвух лёгкіх ёсць сляды фіброзу – паражэння органа, якое ўзнікае пасля пнеўманіі.

Гэта паказвае, што я гэтую пнеўманію перанёс на нагах, і яна ўжо ідзе да заканчэння. Атрымліваецца, што я яе нават не заўважыў.

– Ніякіх сімптомаў не было?

– Спецыфічных – не было. Але трэба ўлічваць, што два з паловай месяцы я працую практычна без адпачынку ў вельмі напружаным рытме і больш нічым не займаюся, акрамя кампаніі па дапамозе медыкам.

Увесь гэты час вечарам я быў настолькі “нежывы”, што мог і не заўважыць хваробу – я і так фізічна адчуваў сябе дрэнна.

Таму мой выпадак яшчэ раз пацвярджае, што рэнтген не заўсёды паказвае пнеўманію. І ёсць меркаванне, што гэта не зусім пнеўманія, бо развіваецца яна не класічным чынам і можа нават не выклікаць тэмпературы.

– Што зараз вам раяць урачы?

– Цалкам прайду курс лячэння, а пасля зраблю яшчэ адзін тэст. Калі ён пакажа, што ў мяне ёсць антыцелы да каранавіруса, то здам плазму, бо такім чынам можна дапамагчы яшчэ камусьці, хто цяжка хварэе.

Кепска тое, што здымак паказвае наяўнасць фіброзу, лёгкія ўжо часткова пашкоджаны, гэта значыць яны згубілі некаторыя функцыі. Гэтая частка лёгкіх не будзе засвойваць кісларод. Я не ведаю, наколькі горш буду дыхаць, чым раней.

Калі ўлічваць, што каранавірус аказвае ўздзеянне і на кроў, трэба будзе таксама рэгулярна адсочваць стан крыві і сасудаў. Так што зараз давядзецца больш пільна сачыць за сардэчна-сасудзістай сістэмай і лёгкімі.

Алесь СІВЫ.

СИТУАЦИЯ

Появится ли в Бресте новый стадион?

Два года назад руководство брестского «Динамо» строило грандиозные планы. Что сегодня?

16 июля 2018 года в Бресте приземлился знаменитый Диего Марадона, который несколькими месяцами ранее заключил с местным «Динамо» контракт. Планировалось, что 58-летний аргентинец будет заниматься вопросами стратегического развития клуба, а также взаимодействовать со всеми его структурными подразделениями, включая детскую академию «Динамо-Брест». Но с тех пор в городе над Бугом Марадону больше никто не видел.

Практически в то же время директор по развитию клуба **Виктор Радьков** заявил, что в Бресте планируется построить стадион на 30 тысяч зрителей.

Стадион хотели назвать в честь шейха Зайда ибн Султан аль-Нахайяна – президента ОАЭ с 1971-го по 2004 год.

«*Наша концепция такая: стадион – это семейная зона, и все, кто приезжает на арену, должны попадать туда не за час до начала игры, а с утра и проводить там весь день до матча*, – делился Радьков радужными планами. – *Женщины, дети найдут чем заняться.*

Мы строим клуб, который интересен не только болельщикам со стажем, но и широкой аудитории. 30 тысяч для Беларуси – это масштабно, но наш босс Диего Марадона будет присутствовать в Бресте, а значит, мы ожидаем, что со всего мира будут приезжать люди».

Как писали классики, «ослепительные перспективы развернулись перед васюкинскими любителями»!..

В планах было начать строительство брестского стадиона имени Зайда ибн Султан аль-Нахайяна уже в этом году, но, похоже, у руководства клуба эйфория уже прошла.

«*Насколько я знаю, от этого проекта в Бресте не отказались, но он находится на стадии проработки деталей*, – рассказал *sb.by* председатель комитета по спортивным сооружениям и обеспечению безопасности на аренах Белорусской федерации футбола **Михаил Ботников**. – *Нужно выбрать место, найти инвестора. Важно понимать, что одно дело – громкие заявления, совсем другое – реализация планов на практике. Обычно между этими этапами проходит большой промежуток времени*».

Впрочем, брестскому «Динамо» сейчас и на самом деле не до стадиона. Глава клуба бизнесмен **Александр Зайцев** откровенно рассказал, что есть проблема со спонсорами, и признался: «*Вместо нулевого баланса у нас в этом году сплошные убытки и затраты…*»

По его словам, даже футболисты в команде сейчас получают всего около 10 процентов от сумм, указанных в их контрактах. Так что фанфары уже отгремели.

Алесь СИВЫЙ.

ЗАПРАШЭННЕ

Купалаўскі вяртаецца!

Паказ спектакляў тэатра аднаўляецца 15 чэрвеня са славутай «Паўлінкі».



Адна з галоўных традыцый Купалаўскага тэатра – распачынаць сезон паказам легендарнага спектакля «Паўлінка». У гэтым годзе абставіны склаліся так, што Купалаўскі адкрые сезон двойчы: пасля двух месяцаў перапынку тэатр аднаўляе свае паказы. І дзеля таго, каб вяртанне гледачоў у тэатр стала сапраўдным святам, ужо 15 чэрвеня на галоўнай сцэне адбудзецца паказ візітоўкі Купалаўскага тэатра – спектакля «Паўлінка».

Якія меры бяспекі абяцаюць у Купалаўскім тэатры?

«*Рассадка будзе ажыццяўляцца праз пэўную дыстанцыю ў два месцы, а агульная напаўняльнасць залы галоўнай сцэны не будзе перавышаць 100 гледачоў (з 338 месцаў), а ў зале Камернай сцэны – не больш за 40 гледачоў (з 80 месцаў)*, – гаворыць адміністрацыя тэатра. – *На пачатку і напрыканцы спектакля будзе праводзіцца абавязковая дэзінфекцыя памяшканняў тэатра. Таксама вы заўсёды можаце скарыстацца антысептыкамі, размешчанымі ў тэатры.*

Мы запрашаем усіх, хто падтрымаў тэатр і не здаў квіток у красавіку, хто жадае хутчэй сустрэцца і пабачыць любімых купалаўцаў і набыў квіток у маі, – мы вас сардэчна чакаем!»

Афіша спектакляў Купалаўскага тэатра ў чэрвені:

15 чэрвеня – «Паўлінка» (Галоўная сцэна);
16 чэрвеня – «Рэвізор» (Галоўная сцэна);
17 чэрвеня – «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (Галоўная сцэна);
18 чэрвеня – «Пінская шляхта» (Галоўная сцэна);
18 чэрвеня – «Першы» (Камерная сцэна);
19 чэрвеня – «Вешальнікі» (Галоўная сцэна);
21 чэрвеня – «Кароль Лір» (Галоўная сцэна);
21 чэрвеня – «Ураджай» (Камерная сцэна);
22 чэрвеня – «Людзі на балоце» (Галоўная сцэна);
22 чэрвеня – «Зямля Эльзы» (Камерная сцэна);
23 чэрвеня – «Паўлінка» (Галоўная сцэна);
23 чэрвеня – «Першы» (Камерная сцэна);
24 чэрвеня – «Радзіва Прудок» (Камерная сцэна).
30 чэрвеня – «Не мой» (Галоўная сцэна).

ВНЕ ИГРЫ

На «Динамо» – за 2 рубля

Озвучена стоимость билетов на состязания чемпионата Беларуси по легкой атлетике, который планируют провести с 31 июля по 2 августа на центральном стадионе Минска.



Как сообщили в Белорусской федерации легкой атлетики, цена билетов будет символической: 2 рубля – для взрослых, 1 рубль – для детей.

Кстати, на днях стало известно, что РУП «Белорусская национальная перестраховочная организация» решила помочь ведущим белорусским легкоатлетам. Свою поддержку страховщики обещали двум ведущим спортсменкам национальной сборной: прыгунье в длину **Анастасии Мирончик-Ивановой** и барьеристке **Алине Талай** *(на фото)*.

